№8 (8)

# ВОЛЬНАЯ Бярозаўка

ГАРАДЗКАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЭТА

## *ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!*

***Калектыў газэты “Вольная Бярозаўка” віншуе ўсіх жыхароў гораду са сьвятам Нараджэньня Хрыстовага і надыходзячым Новым годам.***

***Магчыма, наступны год будзе вельмі цяжкім з-за эканамічнага крызысу. Але ня трэба губляць аптымізму і надзеяў на лепшае.Крызысы пераадольваюць ня ўлады, а народ. Моцныя народы з крызысаў выходзяць яшчэ больш моцнымі. Таму ня трэба здавацца і апускаць рукі. Лепей асэнсаваць, што мы рабілі ня так, каб у будучыні не паўтараць сваіх памылак, каб нам не было сорамна перад нашчадкамі.***

***Вясёлых сьвятаў! Будзьма разам! Будзьма беларусамі!***

## Зарэгістравалі Рух за Свабоду

З чацвертае спробы. Арганізацыя Аляксандра Мілінкевіча стала першай значнай апазіцыйнай структурай, легалізаванай за апошнія 8 гадоў.

Цяпер афіцыйная назва Руху будзе гучаць як Праваабаронча-асветніцкае грамадскае аб’яднанне Рух за Свабоду.

Дакументы на рэгістрацыю прыхільнікамі Мілінкевіча падаваліся ажно чатыры разы, але Мін’юст увесь час знаходзіў нейкія зачэпкі, каб адмовіць.

Намеснік старшыні Руху за Свабоду Юрась Губарэвіч кажа: «Дакументы былі пададзеныя бездакорнымі і фармальна адмовы не павінна было быць. Спадзяюся, што гэты выпадак не стане адзінкавы і будуць задаволеныя заявы іншых дэмакратычных арганізацый, якія падалі дакументы на рэгістрацыю».

Беларускія ўлады працягваюць выконваць патрабаванні Еўрасаюзу. Следам за вызваленнем палітвязняў і вяртаннем у дзяржаўныя сістэмы распаўсюду дзвюх незалежных газет, рэгістрацыю атрымала адна з найбольш шматлікіх палітычных сіл у краіне.

* * *

## Глядзім і чытаем незалежныя СМІ

10 сьнежня першы незалежны беларускі тэлеканал “БЕЛСАТ” адзначыў сваю першую гадавіну ў тэлеэфіры. Па прыблізных падліках, у Беларусі канал глядзяць прыблізна каля 200 000 чалавек – гэта не такая ўжо і малая колькасьць. Тым, хто мае спадарожнікавыя антэны, нагадаем парамэтры наладаў “БЕЛСАТу”: **на спадарожніку SIRIUS – паз.5°E, палярызацыя H, частата 12 379,6 МГц; на спадарожніку ASTRA 1KR – паз.19,2?E, палярызацыя H, частата 10 773МГц. Штодзённа – з 18-й па 24-ю гадзіны.**

Таксама ў вольным распаўсюдзе – незалежныя газэты “Наша Ніва” і “Народная воля”. Пытайцеся ў “Белсаюздруку”, а лепей – падпісвайцеся!

## Цана бэнзіну ў рублях зьнізілася на 10%.

***А ў далярах — аж на 22.***

Калі сусьветныя цэны на нафту зьнізіліся з 140 даляраў да 50, «Белнафтахім» палічыў, што пара бэнзіну таньнець і ў Беларусі. Праўда, не ўтрая, а толькі на 10%.

Такім чынам, кошт бэнзіну А-76 (Н-80) складае ад 1 сьнежня 1.760 руб. за л, бэнзіну АІ-92 — 2.220 руб., бэнзіну АІ-95 — 2.530 руб., дызпаліва — 2.020 руб.

Найбольш цікава, што новыя цэны на паліва моцна розьняцца ў рублях і далярах ЗША. Цана бэнзіну ў рублях зьнізілася на 10%, а ў далярах — аж на 22%. Напрыклад, 95-ы — з $1,34 да $1,04 за літар. «Бэнзінавы» курс рубля да даляра складае, такім чынам, больш за 2400 руб.

Гэта зроблена, каб кампэнсаваць дэфіцыт валюты. Дзяржава разьлічвае, што людзі пачнуць плаціць за паліва ў далярах, а не ў рублях. Крок беспрэцэдэнтны. Ён паказвае, наколькі бракуе валюты ў краіне.

Колькі каштуе паліва ў суседніх краінах?

Даляраў, за літар 95-га бэнзіну, у сярэднім

***Менск, Беларусь – 1,17***
***Варшава, Польшча – 1,27***
***Вільня, Літва – 1,00***
***Рыга, Латвія – 1,0***
***Расія, Масква – 0,85***
***Кіеў, Украіна – 0,73***

***Паводле “Нашай Нівы”, БелаПан***



# БУРА Ў ШКЛЯНЦЫ?

Пасьля скандальна вядомай “антыкарупцыйнай нарады” мінула болей за месяц. І як выконваюцца загады Лукашэнкі аб пакараньні “нячыстых на руку” чыноўнікаў?

Судзьдзі, абвінавачаныя ў карупцыі,дагэтуль працуюць на сваіх месцах і вядуць судовыя працэсы. Хаця кажуць, што “мэханізм звальненьня ўжо запушчаны”. Нібыта, чакаюць толькі ўказу прэзыдэнта – бо толькі ён можа прызначаць і звальняць судзьдзяў.

Чыноўнікі міністэрства ўнутраных спраў, якія патрапілі ў “чорны сьпіс прэзыдэнта”, зволненыя не былі, іх толькі вызвалілі ад займаемых пасадаў.Хутчэй за ўсё, яны будуць пераведзеныя на іншыя пасады.

Былыя намесьнік генеральнага пракурора Купрыянаў і пракурор менскай вобласьці Сьнягір звольненыя з пракуратуры. 12 сьнежня Сьнягір быў узяты пад варту – яму прад’яўлена абвінавачваньне ў злоўжываньні ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі. Купрыянаў пакуль на волі.

Як бачым, зрухі невялікія. Напэўна, у прэзыдэнта з-за крызысу не хапае часу, каб “асабіста пракантраляваць” выкананьне ўласных даручэньняў. А там, глядзіш, і забудзецца. Ці ўжо забыўся?

***Жана Немянтоўская***

# КРЫЗЫС КРОЧЫЦЬ ПА КРАІНЕ

Крыху дзяржаўнай статыстыкі.Яна фатальная: проці верасня адток укладаў склаў 6%, рознічны тавараздварот знізіўся на 3,8%, аб'ём прамысловай прадукцыі скараціўся на 2,9%. Валютная выручка зменшылася проці жніўня на 25%.

Упершыню за доўгія гады ў кастрычніку аб'ём рознічнага тавараздвароту не вырас. Нават знізіўся — на 3,8%. Гэта значыць, насельніцтва адчула эканамічныя цяжкасці і завязала кашалі.

Аб'ём прамысловай прадукцыі скараціўся ў параўнанні з верасням на 2,9%. Сярод рэгіёнаў больш за усіх зменшыла абароты Гродзенская вобласць — мінус 10%. Віцебская скараціла вытворчасць на 7,3%, Мінская — на 5,9%, а Гомельская вобласць на 2%.

Кастрычнік стаў чорным месяцам для чорнай металургіі Беларусі.Зніжэнне вытворчасці ў гэтай галіне, найбольш адчувальнай да сусветнага фінансавага крызісу, склала 23,7%.

Адбыўся абвал вытворчасці трамвайных вагонаў (на 66,7%), электрапыласосаў — на 51,7%, электраплітаў — на 46,9%, макаронных вырабаў — на 23,1%, матацыклаў — на 19,5%, мінеральных угнаенняў — на 12,3%, алею — на 11,2%, тэлевізараў — на 8,7%, трактароў — на 7,1%. Прыкметна прытармазіла цэментавая прамысловасць — на 2,5%.

Са жніўня па кастрычнік ад прададзенай за мяжу прадукцыі паступіла валюты менш амаль на 25%. У верасні падзенне склала 12,9% у дачыненні да жніўня, у кастрычніку — на 16,1% у адносінах да верасня. Гэта самы нізкі паказчык ад студзеня 2008 года.

Валютная выручка беларускіх прадпрыемстваў у лістападзе 2008 года знізілася на 20,1% у параўнанні з кастрычнікам і склала $2,439 млрд.Вось дынаміка валютных паступленняў у краіну за апошнія месяцы:

ліпень $4,018 млрд
жнівень $3,788 млрд (-5,8%)
верасень $3,300 млрд (-12,9%)
кастрычнік $3,051 млрд (-7,5%)
лістапад $2,439 млрд (-20,1%)

Зніжэнне валютнай выручкі пры нязменным курсе рубля і імкненні захаваць аб'ёмы вытворчасці і занятасць прыводзіць да апусташэння золатавалютных запасаў краіны. Справу ратуе толькі тое, што і цэны на сыравіну, якую Беларусь імпартуе, таксама абнізіліся.

Тым часам за 10 месяцаў запасы гатовай прадукцыі выраслі на 43,2%.Больш за ўсё на складах пыліцца гадзіннікаў. Іх запасы ў 29,1 разу перавышаюць сярэднемесячную вытворчасць. Запасаў нашых няякасных ільняных тканінаў больш у 7,1 разу, ваўняных тканінаў у 4,7 разу, садавіна-гароднінных кансерваў — у 3,6 разу (войска наесца ўволю), цукру ў 3,3 разы, пральных машынаў у 2,55 разу, тэлевізараў — на 118,3%.

Попыт на замежныя валюты па-ранейшаму перавышае прапанову. За адзін толькі дзень 12 сьнежня Нацбанк мусіў прадаць $24 млн, 7 млн эўра і 129 млн расейскіх рублёў, каб утрымаць курс гэтых валютаў. Нягледзячы на тое, біржавы курс даляра дасягнуў верхняй прагнознай мяжы за год — 2 200 рублёў.

Значная колькасьць прадпрыемстваў мае пратэрмінаваную запазычанасьць звыш трох месяцаў. Таму паводле гэтых і іншых крытэраў амаль палова беларускіх прадпрыемстваў насамрэч банкруты.

# Камунальныя паслугі зноў даражэюць

Згодна з паведамленьнем Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі,сума плацяжоў за жыллёва-камунальныя паслугі для сям'і з трох чалавек, якая пражывае ў стандартнай двухпакаёвай кватэры агульнай плошчай 48 кв.м, павялічыцца з 1 студзеня ў сярэднім на Br21 тыс. (на 14,8%) і складзе пры нарматыўным спажыванні камунальных паслуг Br162,9 тыс. у абагравальны перыяд. У летні перыяд кошт ЖКП узрасце на Br13,3 тыс. (на 14,4%) да Br106,1 тыс. за двухпакаёвую кватэру.

Згодна з пастановай Саўміна нумар 1942 ад 16 снежня 2008 года тарыф на паслугі па тэхабслугоўванню жылых дамоў з 1 студзеня будучага года ўстаноўлены ў памеры Br296 у месяц за 1 кв.м агульнай плошчы жылога памяшкання, што на 12% перасягае памер дзеючага тарыфу. Новыя цэны і тарыфы на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння складуць Br43 458,3 за 1 Гкал (на 15,6% больш). Тарыфы на халоднае водазабеспячэнне і на каналізацыю павялічацца на 20% і складуць Br385,7 за 1 куб.м і Br242 за 1 куб.м адпаведна. Тарыф за вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адходаў узрасце на 19% да Br4764 за 1 куб.м.

Тарыфы на электрычную энергію для насельніцтва з 1 студзеня 2009 года ўстаноўлены ў памеры Br173,3 за 1 кВт.гадз. (рост на 19,3%).

***Паводле БелаПАН***

# Інвалідаў у Беларусі ўсё больш

**Колькасць інвалідаў у Беларусі з кожным годам расце. Гэты факт канстатуюць у беларускім пратэзна-артапедычным аднаўленчым цэнтры – адзінай падобнай установе на ўсёй постсавецкай прасторы. Штогод тут праз аперацыйны стол праходзяць ля 700 чалавек. У асноўным ампутуюць ногі.**

Як паведаміў Радыё Рацыя дырэктар установы Іван Волкаў, галоўная прычына – судзінныя захворванні.

*- Каля 65 працэнтаў – гэта судзінныя захворванні канцавінаў, варыкознае пашырэнне венаў. Дадаецца яшчэ ля 25 працэнтаў людзей з цукровым дыябетам. Астатняе – бытавы і вытворчы траўматызм, прычым бытавы пераважае: аўтамабільныя аварыі, матацыклы, ровары.*

*Цяпер у Беларусі больш за 511 тысячаў інвалідаў, сярод іх больш за 27 тысячаў дзяцей да 18 год*

***Паводле Радыё Рацыя***

# Непражытыя дні

*“З кожным годам -- болей сьвятаў.*
*З кожным сьвятам -- меней сьвятасьць...”*
***ZET***

Сьвятаў у нас сапраўды шмат. Калі не сказаць – зашмат . Апроч дзяржаўных (афіцыйных), кожны горад і вёска адзначаюць свае дні, зажынкі-дажынкі, закопкі – дакопкі,юбілеі фабрык-заводаў-калгасаў, а на дзяржаўным узроўні ды з дзяржаўным размахам – ночы ў мірскіх замках ды славянскія базары ў віцебсках, ды Дажынкі кожны год у розных гарадох. А яшчэ ж ёсьць і асабістыя-сямейныя-сяброўскія! Карацей, гуляй (не прасыхай) душа!

Нашыя людзі вельмі любяць сьвяты, ці, як яны гавораць, “празьнікі”.Вядома, нічога кепскага няма, калі людзі нешта сьвяткуюць : значыць, ёсьць нагода для весялосьці, радасьці, нешта прыемнае ў жыцьці адбываецца. Толькі чамусьці ўсё гэта нагадвае modus vivendi плебеяў у старажытным Рыме :”Хлеба і відовішчаў!”. Праўда, тут мы іх пераплюнулі : у нас з хлеба і то зрабілі відовішча (згадайце дажынкі)! А яшчэ падабенства ў тым , што ў абодвух выпадках відовішчамі плебеяў забясьпечвае ўлада. Каб народ не сумаваў.

Дарэчы, бліжэйшым часам трэба чакаць, што ўсялякіх гулянак ды фэстаў (ня гледзячы на крызыс) будзе яшчэ болей. “Чаму?” – спытаецца неабазнаны чытач. Адказ возьмем у інтэрв’ю БелаПАНу старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі і па сумяшчальніцтву сэнатара Аляксандра Зімоўскага:”Наперадзе прэзыдэнцкі электаральны цыкл 2009-2011, і я, па традыцыі, буду займацца выключна інфармацыйным ды тэхналягічным забесьпячэньнем фактычна распачатай кампаніі. Хлеба ў нас удосталь, дзякуй Богу. Прыкладзем намаганьні, каб хапіла і відовішчаў.” Вось так. Ня болей і ня меней. Нельга, каб народ падумаў, што жыцьця стала горш і сумней.

Я не называю дні народных гуляньняў сьвятамі, як, дарэчы, ніколі не прымаю ў іх удзелу. Я нават зусім ня супраць, каб у беларускай мове для азначэньня такіх дзён з’явілася слова “празднік”. Бо сьвята – гэта сьвяты дзень, калі чалавек душою набліжаецца да сьвятога, да Боскага. А тое, што адбываецца ў нас, вядзе людзей хутчэй у адваротным кірунку. Усенародная п’янка назаўтра пераходзіць ва ўсенароднае пахмельле, і да нармальнага жыцьця большасьць вяртаецца праз дзень, а то і праз дні. І гэтыя дні выпадаюць з жыцьця. Яны не пражытыя.

**P.S.** Эпіграфам да гэтага артыкулу былі ўзятыя радкі з песьні “Хлопчык” гурту ZET. А на заканчэньне – наступныя два радкі :*”...З кожным сьвятам, з кожным годам –/ болей колькасьць ідыётаў…”*

***Алік Бяздумны***

# ПАКАЗУХА

*Сядзяць два мужыка , выпіваюць , закусваюць , тэлевізар глядзяць . Адзін другому і кажа :”Мікола , я хачу жыць у Беларусі !” . Другі адказвае :” Пятро , дык мы ж у Беларусі і жывем ... Ці ты ўжо дапіўся ?”. “Э , не , дружа , я хачу жыць у той Беларусі , якую па БТ паказваюць !”*

***Сучасны беларускі фальклёр***

Але ж і насамрэч , у нас паўсюль адна паказуха .Шыкоўныя аграгарадкі па тэлебачаньні – і жабрацкія заробкі ў калгасах . Паўсюдная плітка пад нагамі ў населеных пунктах – і гурбы сьмецьця і друзу вакол населеных пунктаў. Гучныя заявы пра мадэрнізацыю вытворчасьці – і праца людзей на дабітым абсталяваньні. Навейшая сельскагаспадарчая тэхніка айчыннай вытворчасьці – і школьнікі з студэнтамі на калгасных палетках.

Уся Беларусь ведае пра новую мехлінію на шклозаводзе “Нёман” , якая ўжо , мабыць , заваліла посудам паўсьвету. І толькі ў Бярозаўцы ведаюць , як насамрэч яна працуе – а працуе яна вельмі рэдка; – і колькі і чаго яна выврабляе – штампуе піўныя куфлі, гранёныя (!) шклянкі, а зараз яшчэ і талеркі. Хаця на завадзкім сайце зусім іншая інфармацыя – выпускаецца ажно 4 (!) асартымэнты (гранёных шклянак і талерак там няма!), ды якія! Колькі разоў мне даводзілася пераконваць знаёмых у розных гарадах Беларусі , што на нашым заводзе сярэдні заробак не мільён , як казаў у сваім выступе па тэлебачаньні наш дырэктар , а амаль удвая меньшы .

Ці, да прыкладу, Шклоўская папяровая фабрыка, ў якую “ўвярнулі” болей за 200 млн.даляраў і на адкрыцьцё якой паўгады таму прыяжджаў Лукашэнка? Ужо тады яму падаравалі нумар мясцовай газэты, надрукаваны нібыта на “сваёй” паперы. Але да сёньня ніводная беларуская друкарня (нават Шклоўская!) не выкарыстоўвае тую паперу, бо надта кепская якасьць. Як і ў Бярозаўцы, ніяк ня могуць наладзіць абсталяваньне.

Новае радзільнае адзьдзяленьне ў Лідзкай бальніцы , якое дараблялі ў паскораных тэмпах да прыезду прэзыдэнта, дзякуй Богу , стаіць (у адрозьненьне ад Краснапольскай школы, якая абвалілася на вучняў, хаця яе таксама адчыняў “сам”) і працуе, але ж у халоднае надвор’е жанчыны ў палатах замярзаюць, бо ў сьпешцы кепска паўсталялі вокны, а перарабляць ніхто не зьбіраецца.

Гэта толькі некалькі прыкладаў з сучаснай беларускай рэчаіснасьці. Так і атрымліваецца, што ўсё ў нас робіцца дзеля прыгожай “карцінкі”, якую потым паказваюць па тэлебачаньні. А людзі сядзяць ля экранаў, і думаюць, што кепска толькі ў іх, а так – па ўсёй Беларусі ўсё выдатна.

Ня вераць людзі сваім вачам. Ды й свайму розуму. Ці ня хочуць верыць?

Яны вераць тэлебачаньню.

***А.Б.***

# Беражыце зубы

Бо аб'ём платных стаматалагічных паслуг у Беларусі плянуецца павялічыць да 70%.

Пра гэта паведаміў галоўны пазаштатны стаматолаг Міністэрства аховы здароўя прафесар Сямён Навумовіч.

Паводле яго слоў, згаданае павелічэнне будзе дасягнута ў тым ліку за кошт адкрыцця дадатковых платных стаматалагічных кабінетаў у дзяржаўных арганізацыях. Як лічыць С.Навумовіч, павелічэнне аб'ёму платных стаматалагічных паслуг у дзяржарганізацыях аховы здароўя зменшыць залежнасць службы ад рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў.
нуецца павялічыць да 70%. Цяпер у дзяржаўным сектары стаматалогіі вырабляцца 65,7% пломбаў з сучасных святлоадбіўных матэрыялаў.
«Гэта выдатная лічба, але калі мы ўстановім мінімальныя сацыяльныя стандарты, гэтую частку насельніцтву, відаць, давядзецца аплачваць, як гэта робіцца ў суседніх рэспубліках», — заявіў С.Навумовіч. Паводле яго слоў, бясплатныя пломбы з сучасных матэрыялаў з'яўляюцца цяжарам для рэспубліканскага бюджэту.

Праўда, прафэсар чамусьці не згадаў, што ў суседніх рэспубліках заробкі і пэнсіі ў некалькі разоў большыя, чым у нас, а стаматалагічныя паслугі – не даражэйшыя.

*Паводле БелаПАН*

## Культавы прадукт эпохі крызысу?

**Мясараслінная кілбаса для жывёлаў "Бобік" вытворчасці гродзенскага мясакамбіната нечакана стала дэфіцытам: многія гарадзенцы, пераважна пенсіянеры, людзі сталага веку і працоўныя, улічваючы істотнае павялічэнне коштаў на прадукты харчавання, самі пачалі ужываюць кілбасу.**

Як сцвярджаюць спецыялісты гродзенскага мясакамбіната, аналагаў кілбасе "Бобік" у краіне няма. Прадукт распрацоўваўся выключна для жывёл, але многія людзі, улічваючы добрыя смакавыя якасці кілбасы і кошт, які складае трохі больш двух тысяч беларускіх рублёў, пачалі з задавальненнем ёй харчавацца.

Не выключана, што ў сувязі з добрым попытам сярод насельніцтва гродзенскі мясакамбінат у хуткім часе пачне вытворчасьць іншых прадуктаў, якія ўтрымліваюць мясараслінныя складнікі (кілбаса "Бобік" утрымлівае аўсяныя дадаткі). Негледзячы на тое, што сабака чалавеку сябар, жыхары горада раяць вытворцам змяніць назву кілбасы на больш чалавечую: як-ніяк яе, акрамя жывёлаў, пачалі ўжываць і людзі.

*Радыё Рацыя*

## ВАРТА ПАМЯТАЦЬ

**5 сьнежня 1994г.** - на нарадзе лідараў АБСЭ ў Будапешце ЗША, Вялікабрытанія і Расея гарантавалі Беларусі бясьпеку і тэрытарыяльную цэласьнасьць.

**8 сьнежня 1991г.** - у Віскулях (Белавеская пушча) падпісаныя пагадненьні аб денансацыі дамовы аб утварэньні СССР і спыненьні існаваньня такой дзяржавы.

**10 сьнежня - сусьветны дзень Дэклярацыі правоў чалавека**

**10 сьнежня 1865г.** - Расейскі царскі ўрад забараніў асобам каталіцкага веравызнаньня і "польскага паходжаньня" купляць і арандаваць зямлю на Беларусі

**11 сьнежня 1991 г.** - Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь зацьвердзіў Палажэньне "Аб Дзяржаўным бел-чырвона-белым сьцягу Рэспублікі Беларусь"

**13 сьнежня 1595г.** - казакі Севярына Налівайкі захапілі Магілеў, разрабавалі і спалілі

**16 сьнежня 1951г.** - у Нью-Ёрку створаны Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва

**17 сьнежня 1926г.** - у СССР прайшоў перапіс насельніцтва. У Беларусі – 4 983 000 насельніцтва

**24 сьнежня 1798 г.** - нарадзіўся Адам Міцкевіч (фальварак Завосьсе, цяпер Баранавіцкі р-н). Беларускі польскамоўны паэт, асьветнік, філямат.

**25 сьнежня 1979 г.** - у Менску міліцыя разагнала Калядную працэсію, якую зладзілі студэнты

**31 сьнежня 1992г.** - беларускія вайскоўцы, памежнікі і супрацоўнікі КДБ склалі прысягу на вернасьць Беларусі. Гэтым актам завершылася юрыдычнае афармленьне ўласных Узброеных Сілаў і ворганаў дзяржбясьпекі

*Пры падрыхтоўцы падборкі выкарыстоўваўся "Беларускі каляндар-даведнік" Ул. Хільмановіча*

ПЕРШАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ТЭЛЕВІЗІЯ БЕЛАРУСІ
www.belsat.eu
БЕЛСАТ tv
BELSAT
на спадарожніку SIRIUS
пазыцыя 5*E
палярызацыя H
чыстата 12379,6 МГц
на спадарожніку ASTRA
пазыцыя 19,2*E
палярызыцыя H
частата 10773 МГц

Рэдактар і выдавец *Алік Бяздумны*
Надрукавана на абсталяваньні рэдактара
Наклад *299 асобнікаў*
Распаўсюджваецца бясплатна
E-mail: biarozauka.info@gmail.com